УДК 811.161.3'42'373.23'282.2(476.2)

***У. А. БОБРЫК***
*(г. Гомель, УА “Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога”)*
***А. М. ЧАРНЫШОВА***
*(г. Гомель, УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыка Скарыны”)*

# ЖАНОЧЫЯ МЯНУШКІ Ў ГАВОРКАХ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

У артыкуле аналізуюцца мянушкі гаворак Гомельшчыны. Праанalізаваны матэрыял сведчыць, што мянушкі складаюць значны пласт лексікі ў гаворках. Рашаючымі фактарамі іх утварэння і ўжывання з’яўляюцца народны гумар і назіральнасць камунікантаў. Мянушкі могуць служыць гістарычнаму даследаванню жыцця народа не ў меншай ступені, чым іншыя помнікі культуры і побыту, літаратуры і мовы. Калі па асобных мянушках цяжка акрэсліць іх каштоўнасць, то сабраныя ў вялікай колькасці яны ілюструюць шмат рысаў побыту беларусаў.

Народная мова з’яўлялася і з’яўляецца асноўнай крыніцай узбагачэння беларускай літаратурнай мовы. Яна, па словах Я. Карскага, яе корань і аснова. Таму трэба адказна і сур’ёзна адносіцца да жывых скарбаў народнай мовы, у тым ліку і да вулічных мянушак, агульных назваў членаў сям’і, роду. Яны ўжываюцца ў паўсядзённым жыцці вяскоўцаў, але не маюць юрыдычнай сілы. Даследчыкі называюць наступныя асноўныя прычыны ўзнікнення мянушак: недастатковую колькасць афіцыйных асабовых назваў у параўнанні з патрэбамі камунікантаў: “Ні адна мова (і беларуская не складае выключэння) не мае ў сваім звароце столькі асабовых імён, каб імі можна было без паўтарэння назваць усіх членаў таго ці іншага грамадскага калектыву” [1, с. 54], імкненне да дакладнай персаніфікацыі пэўнай асобы, выдзяленне яе па якой-небудзь прыкмеце з пэўнага калектыву, асяроддзя [2, с. 118]. Асаблівасць вулічнай мянушкі заключаецца ў тым, што яна ўказвае толькі на аднаго чалавека, на ўласцівыя яму спецыфічныя рысы, не толькі называе асобу, але і трапна характарызуе яе. У гэтым і заключаецца жыццяздольнасць мянушак, інакш яны не прыжыліся б у народзе. Адметнасць ужывання вулічных мянушак у параўнанні з літаратурнай мовай заключаецца ў тым, што ў народна-гутарковай мове яны выкарыстоўваюцца без удакладненняў і часта не спалучаюцца з тымі імёнамі, якія называюць. Шматлікія мянушкі ў гаворках ужываюцца ў нейтральным значэнні.

Вулічныя мянушкі адлюстроўваюць характэрны для вяскоўкі светапогляд, адносіны паміж людзьмі, вясковыя традыцыі, а таму маюць дакладную матывіроўку, якая кладзецца ў аснову семантычнай класіфікацыі.

Сабраны багаты фактычны матэрыял дазваляе вылучыць лексіка-тэматычную групу вясковых мянушак, што характарызуюць псіхічныя якасці асобы. У мянушках падкрэсліваюцца наступныя характарыстыкі асобы:

– *аматарка сварыцца*: **Брытва** (в. Картынічы Лельч.), **Каза** (в. Карпаўка Лоеўск.), **Крыса** (в. Ціхінічы Раг.), **Моська** (в. Азяраны Раг.), **Скаварада** (в. Чорнае Рэч.);

– *вострая на язык*: **Брытва** (в. Майскае Жлоб.), **Жыжка** (в. Глушыца Жлоб.) , **Крапіўка** (г. п. Цярахоўка Добр.);

– *вяртлявая, рухавая*: **Белка** (в. Вуглы Раг.), **Юла** (п. Вялікі Мох Б-Каш.);

– *гаваркая*: **Балабешка** (в. Чамярысы Браг.), **Балабуха** (в. Пірэвічы Жлоб.), **Балоба** (в. Вуглы Раг.), **Балтушка** (в. Шкураты Браг.), **Бараболіха** (в. Хальч Ветк.), **Гаманіха** (в. Шкураты Браг.), **Гамоня** (в. Яроміна Гом.), **Лапатуха** (в. Пакалюбічы Гом.), **Курыца**

(в. Целяшы Гом.), **Лапоцька** (в. Ціхінічы Раг.), **Лапоця** (в. Зялёныя Лукі Гом.), **Мянташка** (в. Пірэвічы Жлоб.), **Сарока** (в. Глушыца Жлоб.), **Сініца** (в. Пярэдзелка Лоеўск.), **Трандычыха** (п. Каравышань Гом.);

– *ганарыстая, самаўпэўненая, фанабэрыстая*: **Карона** (г. п. Церахоўка Добр.), **Гусарка** (в. Пярэдзелка Лоеўск.);

– *гняўлівая, сварлівая*: **Бурбалка** (в. Ляхавічы Жытк.), **Верхал** (в. Старое Сяло Ветк.), **Крыса** (в. Ціхінічы Раг.), **Скаварада** (в. Чорнае Рэч.), **Чубка** (в. Старое Сяло Ветк.), **Цігра** (в. Радзеева Б-Каш.; в. Радуша Жлоб.);

– *гультаяватая, гультайка*: **Блында** (в. Радуга Ветк.), **Калодка** (в. Салтанаўка Жлоб.);

– *задзірыстая, аматарка пабіцца*: **Боўдала** (в. Пірэвічы Жлоб.), **Вайна** (в. Аціркі Петр.), **Вурка** (в. Маркавічы Гом.), **Лаза** (в. Радуша Жлоб.), **Клюка** (в. Вуглы Раг.);

– *зладзейка*: **Маня Далгарукая** (в. Нагорнае Гом.);

– *злая, злосная*: **Аўчарка** (в. Дзімамеркі Лоеўск.), **Клізма** (г. Жлобін), **Навальніца** (в. Маркавічы Гом.), **Піранння** (п. Красны Маяк Гом.), **Рыська** (в. Ванюжычы Петр.), **Соля (Соль)** (в. Бяланавічы Петр.), **Сучка** (в. Кругавец Добр.), **Туча** (г. п. Церахоўка Добр.), **Храпа** (в. Малешаў Жытк.), **Цыбуліна** (г. п. Церахоўка Добр.), **Цытра** (в. Уборак Лоеўск.);

– *легкадумная*: **Мар'я Брында** (в. Бушацін Б-Каш.);

– *маўклівая*: **Моўша** (в. Краснаселле Хойн.), **Рыбіна** (в. Уборак Лоеўск.);

– *назойлівая, надакучлівая*: **Дапякучка** (в. Кароткавічы Жлоб.), **Жужка** (в. Бывалькі Лоеўск.);

– *неахайная*: **Абезьяна** (в. Чорнае Рэч.), **Абрыданніца** (в. Ламавічы Акц.), **Ануча** (в. Чорнае Рэч.), **Бейза** (в. Майскае Жлоб.), **Галапупенка** (в. Касцюкоўка Гом.), **Гірма** (в. Дабрынь Чач.), **Гламазда** (п. Усход* Б-Каш.), **Дзяружка** (п. Каравышань Гом.), **Дзюндзіха** (в. Пратасы Акц.), **Дыдуха** (в. Церабееўка Рэч.), **Замарашка** (в. Рагі Гом.), **Зёпа** (в. Рэчкі* Ветк.), **Кабыла** (в. Рэчкі* Ветк.), **Караўка** (в. Рэчкі* Ветк.), **Квашня** (в. Уборак Лоеўск.), **Кікімара** (в. Сямурадцы Жытк.), **Клуша** (в. Тонеж Лельч.), **Кулёма** (в. Ліпнякі Лоеўск.), **Кура** (в. Ліпнякі Лоеўск.), **Лахудра** (г. Жлобін; в. Удалёўка Лоеўск.), **Леля** (в. Пірэвічы Жлоб.), **Малпа** (в. Конкавічы Петр.), **Мурза** (в. Антонаўка Маз.), **Мурзілка** (в. Малінаўка Лоеўск.), **Незграя** (в. Кіраў Нар.), **Нераха, Нікеча, Няўдоба** (в. Смалегаў Нар.), **Порхаўка** (в. Церабаў Петр.), **Пугачыха** (в. Шкураты Браг.), **Растропа** (в. Церабаў Петр.), **Рассахора** (в. Прудок Гом.), **Рэпанка** (в. Сямурадцы Жытк.), **Салоха** (в. Конкавічы Петр.), **Свіння** (в. Конкавічы Петр.), **Хероня** (в. Уборак Лоеўск.), **Цюрыха** (в. Маркавічы Гом.), **Чупачка** (в. Маркавічы Гом.), **Чухонка** (в. Зяткавічы Карм.);

– *нелюдзімая*: **Дзічка** (п. Вялікі Мох Б-Каш.), **Капуста** (в. Шарпілаўка Гом.);

– *палахлівая, баязлівая*: **Чайка** (в. Сямурадцы Жытк.), **Крот Вольга** (в. Тонеж Лельч.);

– *песімістка, увесь час скардзіцца, жаліцца*: **Бядуха** (в. Вуглы Раг.), **Канька** (в. Елянец Б-Каш.), **Кароста** (в. Кавалёўка Раг.), **Няшчасніца** (в. Сямурадцы Жытк.), **Обіда** (в. Малешаў Жытк.);

– *плаксівая, шмат плача*: **Вербачка** (в. Карма Добр.), **Галасуха** (в. Зяткавічы Карм.), **Кісліца** (в. Насовічы Добр.), **Слёзка** (в. Астражанка Лельч.);

– *пляткарка*: **Аўчарка** (в. Дзімамеркі Лоеўск.), **Балаболка** (п. Усход* Ветк.), **Варона** (в. Каравацічы Калінк.), **Налопа** (в. Залессе Чач.), **Сарока** (в. Шкураты Браг.), **Свіста** (в. Рагі Гом.), **Ціліўкала** (в. Кузьмінічы Добр.);

– *працавітая, працалюбівая*: **Камета** (в. Маркавічы Гом.), **Мурашка** (в. Сямурадцы Жытк.), **Пчолка** (в. Хальч Ветк.), **Хвілінка** (в. Алексічы Хойн.);

– *скупая, сквапная*: **Беда** (в. Колкі Петр.), **Гнеда** (в. Церабееўка Рэч.), **Драла** (в. Новы Сцепаноў Браг.), **Скапчыха** (п. Каравышань Гом.), **Хамідла** (в. Саўгаснае Б-Каш.), **Хапка** (в. Кавалёўка Раг.), **Хова** (в. Красноўка Нараўл.);

– *сонная, санлівая, любіцельніца доўга паспаць*: **Храпа** (в. Малешаў Жытк.), **Храпела** (в. Асобіна Б-Каш.);

– *спрытная, рухавая*: **Белка** (в. Уборак Лоеўск.);

– *усюды ўлазіць, умешваецца*: **Шыла** (в. Грохаў Лоеўск.);

– *хітрая*: **Круцька** (в. Рудня Целяшоўская Гом.), **Ліса** (в. Ціхінічы Раг.), **Лука** (п. Вя-лікі Мох Б-Каш.);

– *цяжкі характар*: **Сонька Вырві глаз** (в. Асобіна Б-Каш.).

Многія вясковыя мянушкі характарызуюць асобу паводле фізічных асаблівасцей, паталагічных адхіленняў. Такімі вулічнымі найменнямі называюць жанчыну, калі яе добра ведаюць:

– *мажная*: **Домна Бык** (п. Усход* Б-Каш.);

– *блізарукая*: **Томка Скалавокая** (п. Усход* Б-Каш.), **Касабланка** (в. Вялікі Мох Б-Каш.), **Коса** (в. Сямурадцы Жытк.);

– *глухая*: **Ганна Глухая** (в. Елянец Б-Каш.), **Цяцера** (г. п. Церахоўка Добр.);

– *гарбатая*: **Кіёўка** (г. п. Церахоўка Добр.), **Насця Гарбаціха** (в. Елянец Б-Каш.);

– *з вялікімі вачыма, зубамі, носам*: **Кобра** (в. Целяшы Гом.), **Лупа** (Вялікі Мох Б-Каш.), **Сава** (в. Ціхінічы Раг.), **Зубатка** (в. Буда-Люшаўская Б-Каш.), **Зубіха** (в. Тонеж Лельч.), **Насарка** (в. Каралін Хойн.);

– *з крывымі нагамі, бокам і г. д.*: **Насця Крывобока** (в. Сямурадцы Жытк.), **Калчаногая** (в. Зялёныя Лукі Гом.), **Кашалапка** (в. Кругавец Добр.) **Маня Крывая** (в. Ду-най Рэч.), **Крывалапка** (в. Вулкан Лоеўск.);

– *з чырвоным тварам*: **Краснапёрка** (в. Маркавічы Гом.), **Маркоўка** (в. Нова-маркавічы Гом.);

– *пры хадзьбе перакульваецца*: **Вутка** (в. Глушыца Жлоб.), **Качка** (в. Майскае Жлоб.), **Утка** (в. Цярэшкавічы Гом.);

– *без нагі*: **Маня Бязнога** (в. Сямурадцы Жытк.);

– *худая*: **Лена Сухая** (в. Елянец Б-Каш.), **Траска** (в. Шкураты Браг.), **Таранка** (в. Пярэдзелка Лоеўск.), **Шчэпка** (в. Маркавічы Гом.);

– *малая*: **Булачка** (в. Леніна Добр.), **Кацюшка** (в. Глушыца Жлоб.), **Кнопка** (в. Майскае Жлоб.), **Кузюлька** (в. Малінаўка Лоеўск.), **Курапатка** (в. Радуга Ветк.);

– *малая і тоўстая*: **Бомба** (в. Рагінь Б-Каш.), **Дзежка** (в. Сямурадцы Жытк.), **Жлукта** (в. Глушыца Жлоб.), **Ступка** (в. Касцюкоўка Гом.), **Торба** (в. Пeравалока Рэч.), **Торбіха, Тумба** (в. Жгунь Добр.) ;

– *з вялікім, малым бюстам*: **Цыцарка** (в. Алексічы Хойн.), **Фанера** (в. Маркавічы Гом.).

Большасць мянушак характарызуе вяскоўцаў паводле знешняга выгляду:

– *колеры валасоў*: **Белая варона** (в. Пірэвічы Жлоб.), **Белая Таццяна** (в. Азершчына Рэч.), **Белка** (в. Карпаўка Лоеўск.), **Манька Чорная** (в. Асобіна Б-Каш.), **Рыжая** (в. Кара-вацічы Калінк,), **Смалянка** (в. Вуглы Раг.);

– *прыгожая*: **Бяроза** (в. Уборак Лоеўск.), **Вішанька** (в. Карма Добр.), **Каліна** (в. Красны Маяк Гом.), **Карцінка** (в. Малы Малешаў Жытк.), **Княгіня** (г. п. Церахоўка Добр.), **Красаўка** (в. Карпаўка Лоеўск.), **Ліпка** (в. Яроміна Гом.), **Рабіна** (г. п. Церахоўка Добр.), **Роза** (в. Асо-біна Б-Каш.), **Таполя** (г. п. Церахоўка Добр.).

Цікавымі з’яўляюцца мянушкі, што з’явіліся ў працэсе моўных зносін. Яны адлюстроўваюць спецыфічныя індывідуальныя асаблівасці гаворкі пэўных камунікантаў, указваюць на артыкуляцыйныя асаблівасці мовы, называюць словы ці выразы, якія носьбіт часта ўжывае, характарызуюць гучнасць голасу:

– **Маруся Бляха** – часта ўжывала слова *бляха* (п. Усход* Б-Каш.), **Абразованная** – ад частага ўжывання выразу “*я ж абразованная*” (в. Пярэдзелка Лоеўск.), **Абыціха** – ад частага ўжывання выразу “*абы ціха*” (в. Гіроў Рэч.), **Атокша** – ад частага ўжывання выразу “*а то*” (в. Глушыца Жлоб.), **Кука** – хавалася і крычала “*ку-ку*” (в. Васількоў Рэч.).

У аснове той ці іншай мянушкі ляжыць рэальны факт або здарэнне, якое адбылося ў жыцці той ці іншай вяскоўкі. Напрыклад:

– **Баба Клёніха** – ляжала пад клёнам і спявала: “Клён – мой дом родной” (п. Усход* Б-Каш.); **Груня з Брэста** – ездзіла да ваенаслужачага ў горад Брэст (в. Майскае Жлоб.); **Домна ля печы** – першую шлюбную ноч правяла каля печы (г. Жыткавічы), **Крынянка** – дачка рабіла каўбасу з крыві, але маці не спадабаўся гатунак, і яна, смяючыся, назвала яго крынянка (в. Каравацічы Рэч.), **Палоніха** – у час вайны пабывала ў палоне (в. Каравацічы Рэч.), **Парцізанка** – 1. Была ў партызанскім атрадзе (в. Алексічы Хойн.); 2. Нарадзілася ад партызана (в. Ванюжычы Петр.).

Намі выяўлены ў гаворках Гомельшчыны мянушкі, якія характарызуюць асобу паводле захапленняў, схільнасцей да якога-небудзь дзеяння: **Золушка** – насіла шмат залатых упрыгожанняў (в. Пірэвічы Браг.); **Марыя Хлапчурка** – сябравала з хлопцамі (в. Бушацін Лоеўск.); **Бяссоліха** – не саліла стравы (в. Сямурадцы Жытк.); **Наша Русланава** – па маладосці спявала песні з рэпертуара артысткі Л. Русланавай (в. Каравацічы Рэч.), **Рамоніха** – вырошчвала рамонкі (в. Хальч Ветк.); **Сербіянка** – любіла танцаваць (в. Астражанка Лельч.).

Асобныя мянушкі могуць указываць на месца жыхарства: **Антонаўка** – з вёскі Антонаўка (в. Хальч Ветк.); **Арлоўка** – з г. Арол (в. Лучын Раг.); **Ева Курыка** – з вёскі Курыцічы (в. Ванюжычы Петр.); **Галя Слепчанка** – ад былой назвы вёскі Слепцы, зараз вёска Знаменка (в. Сямурадцы Жытк.); **Насця Полешка** – з Палесся (в. Сямурадцы Жытк.), **Вольга Валынка** – з Валынскай вобласці (в. Курганне Раг.).

Па-featureрознаму называюць у гаворках жанчын у залежнасці ад адносін да сямейнага становішча, шлюбу: **Вянчанка** – вянчалася ў царкве (в. Кажушкі Хойн.); **Гарнізонаўка** – было шмат мужчын (в. Маркавічы Гом.); **Гуля** – разбэшчаная (в. Холмеч Рэч.); **Кошка** – разбэшчаная (в. Холмеч Рэч.); **Пястуха – якую песцяць; балаўніца** (в. Церабееўка Рэч.); **Самазванка** – сама прыйла жыць да хлопца (в. Церабееўка Рэч.), **Скараспелка** – рана выходзіць замуж (в. Слабада Б-Каш.).

Паводле разумовых здольнасцей асобу ў гаворках Гомельшчыны называюць: **Апенька** – разумова абмежаваная (в. Шарпілаўка Гом.), **Мар’я Нізнайка** (в. Елянец Б-Каш.).

Прааналізаваны матэрыял сведчыць, што мянушкі складаюць значны пласт лексікі ў гаворках Гомельшчыны. Рашаючымі фактарамі іх утварэння і ўжывання з’яўляюцца трапны народны гумар і назіральнасць камунікантаў. Нельга не пагадзіцца з У. Юрэвічам, які слушна адзначае, “як пабагацелі б мы, каб больш даследавалі паходжанне беларускіх імён і прозвішчаў, традыцыйных мянушак, усяго народнага іменаслоўя, каб мелі, нарэшце, поўны збор антрапонімаў, носьбіты якіх жывуць на Беларусі і з’яўляюцца жывым помнікам” [1, с. 111].

Такім чынам, мянушкі могуць служыць гістарычнаму даследаванню жыцця народа не ў меншай ступені, чым іншыя помнікі культуры і побыту, літаратуры і мовы. Калі па асобных мянушках цяжка акрэсліць усю іх каштоўнасць, то, сабраныя ў вялікай колькасці, яны ілюструюць шмат рысаў побыту беларусаў.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

1 Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.] – Віцебск : УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2009.

2 Усціновіч А. К. Найменні асоб мужчынскага полу ў актавых запісях Гродзеншчыны і Брэстчыны XVI-XVII стст. // З жыцця роднага слова. – Мінск, 1968.

3 Юрэвіч Ул. Слова жывое, роднае, гаваркое... / Ул. Юрэвіч. – Мінск : “Мастацкая літаратура”, 1988.

Спіс умоўных скарачэнняў (раёнаў):

Акц. – Акцябрскі; Б-Каш. – Буда-Кашалёўскі; Браг. – Брагінскі; Ветк. – Веткаўскі; Гом. – Гомельскі; Добр. – Добрушскі; Жлоб. – Жлобінскі; Жытк. – Жыткавіцкі; Калінк. –

Калінкавічскі; Карм. – Кармянскі; Лельч. – Лельчыцкі; Лоеўск. – Лоеўскі; Маз. – Мазырскі; Нар. – Нараўлянскі; Петр. – Петрыкаўскі; Раг. – Рагачоўскі; Рэч. – Рэчыцкі; Светл. – Светлагорскі; Хойн. – Хойніцкі; Чач. – Чачэрскі.

* Страчаныя вёскі.

The article analyzes the minutiae of Gomelshchyna's vocabularies. The analyzed material shows that minuscule words form a significant part of the lexicon in the newspapers. The most important factors of their decoration and usage are folk humanor and the moralism of the communicants. The mines can serve as a historical study of the people's life no less than other monuments of culture and life, literature and language. It is hard to emphasize their quality, but they are collected in large numbers and illustrate a lot of Belarusian visits.